УДК[902+257.7–9+39] (476) (=16)”10/11”
https://doi.org/10.33402/mdapv.2018-22-135-155

*ISSN 2223-1218*
*Матеріали і дослідження*
*з археології Прикарпаття і Волині.*
*2018. Вип. 22. С. 135–155.*

# СЛАВЯНСКІЯ ПАХАВАННІ З ДРАЎЛЯНЫМІ ВЁДРАМІ: АРЭАЛ РАСПАЎСЮДЖАННЯ, ХРАНАЛОГІЯ, ВЫТОКІ ТРАДЫЦЫІ, СЕМАНТЫКА

*Эдвард ЗАЙКОЎСКІ*

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі,*
*вул. Сурганава, 1/2, 220072, г. Мінск, Беларусь, e-mail: edvard_mensk@tut.by*

Адной з прыналежнасцяў пахавальнага інвентару славян XI–XII стст. былі драўляныя вёдры, якія на ўсходзе Еўропы адсутнічалі толькі ў курганах ільменскіх славен, вяцічаў, часткова крывічоў. Трапляюцца яны і ў тых могільніках, дзе маюцца пахаванні скандынаваў.У гэты ж час драўляныя вёдры прысутнічалі і ў некропалях на абшарах Польшчы, Славакіі і Чэхіі. У двух апошніх краінах гэтая традыцыя была распаўсюджана яшчэ з VI–VII стст. і хутчэй за ўсё была запазычана ад германскага племя лангабардаў.Дастаткова рана такія пахаванні з’явіліся ў славян на тэрыторыях Трансільваніі і Харватыі (уключаючы ўзбярэжжа Адрыятыкі). У перыяд рымскіх уплываў драўляныя вёдры нярэдка траплялiся ў могільніках пшэворскай, любошыцкай, вельбарскай і іншых германскіх паводле этнічнай прыналежнасці культур. У сваю чаргу, звычай хаваць з вёдрамі быў пераняты германцамі ад кельтаў (латэнская культура). Пісьмовыя помнікі часоў Кіеўскай Русі, некаторыя археалагічныя знаходкі, а таксама пазнейшы фальклор даюць падставу вызначаць семантыку вядра ў духоўнай культуры як шлюбна-сексуальнага сімвалу.

***Ключавыя словы***: славяне, драўляныя вёдры, пахавальны інвентар, германцы, кельты, шлюбна-сексуальны сімвал.

У свой час Л. У. Дучыц звярнула ўвагу на пэўнае распаўсюджанне сярод пахавальнага інвентару раннесярэднявечных курганных могільнікаў Беларусі рэшткаў драўляных вёдраў. Згодна ёй, на тэрыторыі Беларусі вядома больш за паўсотні курганных пахаванняў, у якіх выяўлены жалезныя абручы, дужкі і вушкі ад драўляных вёдраў. Мяркуючы па металічных дэталях, дыяметр вёдзер быў 12–35 см і вышыня – 20–30 см. Вядро звычайна ставілася каля ног нябожчыка. З 30 дастаткова поўна дакументаваных знаходак вёдраў у 24 курганах знойдзены драўляныя, у 3 – берасцяныя і яшчэ ў 3 – керамічныя імітацыі драўляных ці берасцяных вёдзер. Паводле падлікаў Л. У. Дучыц, сярод 24 курганоў з драўлянымі вёдрамі ў інвентары 5 насыпаў былі з парнымі пахаваннямі, 1 насып – з трыма пахаваннямі, 11 курганоў – з пахаваннямі мужчын і 7 курганоў – з пахаваннямі жанчын. У адным з курганоў каля Бабруйска вядро было ўпрыгожана сярэбранымі пазалочанымі бляхамі і такая ж круглая бляха высцілала дно ўнутры [Дучыц, 1994, с. 49–53]. Усяго на карце Л. У. Дучыц адзначана 57 мясцінаў, дзе меліся курганныя пахаванні з вёдрамі, хоць у тэксце яе артыкула названа 28 помнікаў. Акрамя таго, пра рэшткі драўлянага вядра каля ног нябожчыка ў багатым парным пахаванні каля в. Драздова Талачынскага раёна паведамляла В. М. Ляўко [Левко, 2004, с. 69], а пра вядро ў кургане каля в. Сычкава Бабруйскага раёна – Т. М. Каробушкіна [Каробушкіна, 1993, с. 58–59]. Пра шэраг знаходак вёдраў у курганах поўдня Беларусі сабрала звесткі І. П. Русанава [Русанова, 1966, с. 29]. Картаграфаванне знаходак вёдраў у курганах Беларусі (мал. 1) паказвае, што яны сустракаюцца пераважна ў паўднёвай і цэнтральнай частках Беларусі, а таксама на водападзеле Дняпра і Дзвіны, і на самым поўдні басейна Заходняй Дзвіны, на правабярэжжы ж Дзвіны знаходкі вёдзер у курганах невядомыя. Па племяннoй прыналежнасці нябожчыкі з вёдрамі ў інвентары належалі да аб’яднання дрыгавічоў [Лысенко, 1991, с. 86, 157–242], туды ж варта

© Зайкоўскі Э., 2018

аднесці і некаторыя пахаванні Дняпроўска-Дзвінскага водападзелу і нават поўдня Падзвіння, у якіх трапляюцца дрыгавіцкія этнавызначальныя ўпрыгожанні. Досыць шмат вядома пахаванняў з вёдрамі на тэрыторыі радзімічаў, дзе яны вядомыя на 13 помніках [Богомольников, 2004, с. 42]. Амаль выключна пахаванні з вёдрамі сустракаюцца ў курганах, якія належалі славянскаму насельніцтву. Ва ўсходнелітоўскіх курганах і могільніках іншых балцкіх плямёнаў знаходкі іх невядомыя (выключэнне – яцвяжскія курганы каля в. Ясудава Гродзенскага раёна, але зрэшты там знойдзена керамічная імітацыя вядра). У Падросі (каля Ваўкавыска) вядро знаходзілася ў кургане з каменнымі канструкцыямі, але з упрыгожанняў там сустрэты паўтараабаротныя скроневыя колцы. Пахаванняў з драўлянымі вёдрамі няма на большай частцы арэалу крывічоў.



Мал. 1. Карта распаўсюджання пахаванняў XI–XII стст. з драўлянымі вёдрамі ва ўсходняй частцы Еўропы

Fig. 1. Map of the distribution of XI–XII centuries burial places with wooden buckets in the eastern part of Europe

На тэрыторыі Беларусі вёдры знойдзены толькі ў курганах з трупапалажэннямі як мужчын, так і жанчын, і рэшткі іх невядомыя ў пахаваннях з трупаспаленнем. Гэта дазваляе датаваць пахаванні з вёдрамі перыядам пасля знікнення абраду крэмацыі, г.зн. не раней чым другой паловай X, і XI – першай паловай XII ст.

Акрамя паўднёвай часткі арэалу крывічоў, рэшткі вёдраў выяўлены пры раскопках курганнай групы Харлапава каля Дарагабужа на Смаленшчыне. З 74 раскапаных курганоў у 10 былі пахаванні з вёдрамі каля ног, належалі ўсе яны мужчынам. Я. А. Шмідт, які даследаваў курганы ў Харлапаве, датуе іх перыядам ад канца X ці пачатку XI ст. і да пачатку XIII ст. [Шмидт, 1957, с. 200, 215]. Апрача таго, пахаванні з вёдрамі ў раёне Дарагабужа вядомыя ў курганах каля в. Усвяцце і ва ўрочышчы Мутышына. Там вёдры знаходзіліся ў пахаваннях мужчын і былі, паводле назіранняў Н. І. Савіна, бярозавыя і дубовыя, з жалезнымі дужкамі і абручамі “добрай работы” [Савін, 1930, с. 240–241].Самымі ўсходнімі з’яўляюцца знаходкі вёдзер паблізу р. Угры, аднаго з прытокаў Акі: у кургане каля в. Шатуны Угранскага раёна

Смаленскай вобл. [Булычев, 1913, с. 29, рис. 13] і ў кургане з крэмацыяй каля в. Слевідава Перамышльскага раёна Калужскай вобл. (мал. 1). Апошняе пахаванне па знаходках ганчарнай керамікі датавана XI ці XIIст.[Изюмова, 1970, с. 238]. У зоне кантактаў полацкіх і пскоўскіх крывічоў драўляныя вёдры трапіліся ў курганнай групе Грыцкава недалёка ад Себежа Пскоўскай вобласці [Седов, 1971, с. 52]. У астатняй частцы арэалу пскоўскіх крывічоў, а таксама ў пахаваннях наўгародскіх славен і вяцічаў знаходкі вёдраў невядомыя. Аднак яны былі распаўсюджаны ў курганных пахаваннях славянскіх плямёнаў сучаснай паўночнай Украіны. Так, яны сустрэтыя ў шэрагу курганоў валынян (могільнікі Басаў Кут, Белеў, Красне, Плісненск, Перасопніца, Тэклеўка). Форма вёдраў была ўсечанаканічная, вышыня 20–30 см, дыяметр асновы 15–30 см. У курганах драўлян вёдры часцей сустракаюцца з пахаваннямі мужчын. Досыць шмат пахаванняў з драўлянымі вёдрамі на племянной тэрыторыі палян (Барахцянская Альшанка, Грубск, Кіеў, Леплява, Пераяслаўль, Седнеў). Вядомыя знаходкі драўляных вёдраў і ў курганах севяран [Русанова, 1966, с. 30–33, 35–37; Седов, 1982, с. 101, 106, 111, 140]. Па літаратуры вядома, што пахаванні валынян з вёдрамі змяшчаліся ў курганах з трупапалажэннямі, а значыць, датуюцца перыядам не раней другой паловы X ст. В. В. Сядоў і шэраг іншых даследчыкаў лічаць, што дрыгавічы, валыняне, драўляне і паляне паходзілі ад раннеславянскай культуры тыпу Лукі-Райкавецкай (VIII–X ст.), якая атаясамліваецца з летапіснымі дулебамі, і характарызаваліся шэрагам агульных этнаграфічных рысаў. У сваю чаргу, культура тыпу Лукі-Райкавецкай узнікла на аснове больш ранняй пражскай культуры. Іншае паходжанне, як мяркуецца, мелі севяране, але іхнія курганы характарызуюцца бедным інвентаром, як і ў плямёнаў дняпроўскага правабярэжжа – валынян і палян [Седов, 1982, с. 140]. Зрэшты, на думку В. В. Сядова, звычай насыпаць курганы ў севяран з’явіўся ў выніку інфільтрацыі славянскага насельніцтва з былога дулебскага арэалу[Седов, 1995, с. 200], а іншыя даследчыкі, у прыватнасці І. І. Ляпушкін, увогуле лічылі, што славяне пранікл на Дняпроўскае левабярэжжа каля VIII ст. з захаду, з тэрыторыі культуры тыпу Лукі-Райкавецкай [Ляпушкин, 1961, с. 356–366]. Характэрна, што ў нашчадкаў насельніцтва пянькоўскай культуры – племяннога саюзу белых харватаў – пахаванні з драўлянымі вёдрамі невядомыя. У полацка-смаленскіх крывічоў такія пахаванні траплялiся толькі ў Падняпроўі і на паўднёвай ускраіне басейна Дзвіны, не заходзячы ў глыбіню Падзвіння.

На этнічным памежжы дрыгавічоў і мазаўшан знаходкі драўляных вёдраў, дакладней, металічных дэталяў ад іх, вядомыя на Падляшшы, у прыватнасці, у могільніку Данілова-Малое (на захад ад Суража), які датуецца другой паловай XI–XII ст. [Koperkiewicz, Krasnodębski, 2002, s. 271–274]. Досыць распаўсюджаным прадметам інвентару вёдры з’яўляліся ў пахаваннях з каменнымі канструкцыямі ў Мазовіі і Падляшшы, якія лічацца пахавальнымі помнікамі мазаўшан. Л. Раўгут, які прысвяціў гэтым помнікам спецыяльную манаграфію, драўляныя вёдры датаваў перыядам да 1100 г. і дапускаў магчымасць іх ужывання да сярэдзіны XII ст. [Rauhut, 1971, s. 473]. В. В. Сядоў, які падкрэсліваў значную ролю заходнебалцкага кампаненту ў фармаванні мазаўшан, звяртаў увагу на тое, што ў каменных могільніках Мазовіі і Падляшша вёдры часцей трапляюцца ў жаночых пахаваннях другой чвэрці XI – пачатку XII ст., якія мелі заходнюю арыентыроўку, у адрозненне ад пахаваных у асноўных галовамі на ўсход мужчын. Значыць, мужчыны мелі мясцовае балцкае паходжанне, а жанчыны былі прышлымі славянкамі [Седов, 1997, с. 168–169].

Яшчэ далей на захад драўляныя вёдры былі знойдзены ў бірытуальным грунтовым могільніку Лютамерск (заходней Лодзі). Вёдры былі на тым могільніку ў чатырох дзесятках грунтовых пахаванняў з трупапалажэннямі [Miśkiewicz, 1969, s. 280, tab. 26]. Вёдры ў складзе пахавальнага інвентару вядомыя ў раннесярэднявечных могільніках з трупапалажэннямі Малапольшчы, у асноўным заходней Віслы (мал. 1). Палеабатанічны аналіз валокнаў дрэва з могільніка Кракаў-Закшуўка паказаў, што вядро было зроблена з драўніны ціса [Zoll-Adamikowa, 1971, s. 115]. Яшчэ ў міжваенны перыяд рэшткі драўляных вёдзер былі знойдзены ў цэлым шэрагу грунтовых могільнікаў Вялікапольшчы [Rajewski, 1937, s. 73–74], якія датуюцца XI–XII ст. Самыя заходнія з могільнікаў, дзе трапляецца гэта катэгорыя рэчаў, знаходзяцца ў



Мал. 2. Металічныя дэталі ад сярэднявечных вёдраў (*1–8* – Стары Коуржым; *9* – Мікульчыцы–Клаштэржыска; *10, 12* – Старазрэмбы; *11* – Дольны Петэр IV)
Fig. 2. Metal details of medieval buckets (*1–8* – Stary Kouřim; *9* – Mikulčice-Klašteřisko; *10, 12* – Starozręby; *11* – Dolny Peter IV)

сярэднім цячэнні р. Варты, у ваколіцах Познані (мал. 1), а на паўднёвым захадзе Польшчы сустракаюцца ў вярхоўях Одры ў Верхняй Сілезіі (Грошэвіцэ каля Аполе) [Miśkiewicz, 1969, s. 277, tab. 16]. Адным з самых паўночных помнікаў з такімі рэшткамі з'яўляецца могільнік Бжэсць – Куяўскі [Kaszewscy, 1971, s. 428–432]. Звычайна вядро ў магіле ставілася каля ног нябожчыка. Для таго, каб прааналізаваць спадарожны інвентар у пахаваннях Польшчы з вёдрамі, узяты два найбольш вывучаныя могільнікі – Коньскія (раскапана 170 магілаў, у 16 з іх былі вёдры) і Лютамерск (131 магіла, з іх 41 з вёдрамі). Аказалася, што вёдры без іншых рэчаў трапляюцца рэдка. З прадметаў пахавальнага інвентару найбольш часта вёдрам спадарожнічалі нажы, далей па ўбываючай колькасці ішлі крэсівы, скроневыя колцы, спражкі, керамічныя

пасудзіны, тачыльныя брускі. Вёдры былі як у мужчынскіх, так і ў жаночых пахаваннях. У могільніку Лютамерск вёдры неаднаразова трапляліся ў пахаваннях са зброяй – 16 разоў разам з дзідамі і 1 раз – разам з мечам.

Паводле інфармацыі, якую прыводзіць М. Дзік, драўляныя вёдры, рэшткі якіх знойдзены ў раннесярэднявечных пахаваннях Польшчы, мелі ўнутраны дыяметр (з улікам таго, што форма вырабаў часта была не цыліндрычнай, а ўсечанаканічнай) ад 21 да 25 см, а вышыню – ад 13 да 26 см. Было вызначана, што ўмяшчальнасць вёдраў вагалася ад 4,4 да 5,7 літра [Dzik, 2006, s. 86–87].

Абсалютная большасць пахаванняў з вёдрамі ў Польшчы належыць да грунтовых могільнікаў з трупапалажэннямі. У пахаваннях з крэмацыяй вёдры вядомыя толькі ва ўжо згаданым могільніку Лютамерск, а таксама ў могільніку Стшыкоцін на Заходнім Памор'і [Zoll-Adamikowa, 1979, s. 156]. Адной з прычын такой невялікай колькасці знаходак вёдраў у пахаваннях з трупаспаленнямі з'яўляецца тое, што пахавальныя помнікі сукаўска-дзедзіцкай культуры VI–X ст., насельніцтва якой займала значную частку цэнтральнай і заходняй Польшчы, увогуле не паддаюцца выяўленню, а таксама што пры трупаспаленнях ня ўсе нават металічныя дэталі захоўваліся. У Лютамерску пахаванні з трупаспаленнямі датуюцца канцом X–XI ст. [Седов, 1995, с. 346]. Некаторыя археолагі мяркуюць, што могільнік, ці прынамсі яго частка, пакінуты немясцовым насельніцтвам. Так, Л. Раўгут аднёс яго да помнікаў мазаўшан, а К. Яджэўскі лічыў, што частка пахаванняў, асабліва з трупаспаленнямі, пакінуты выхадцамі з тэрыторыі Кіеўскай Русі ў пачатку XI ст. [Ядджевский, 1978, с. 216–217].

Але значна больш драўляныя вёдры вядомыя ў раннесярэднявечных могільніках Чэхіі, Славакіі і дзе-нідзе – паўночнай часткі Венгрыі. На паўночным захадзе Чэхіі ў могільніку з трупапалажэннямі Жаланы (ваколіцы горада Тэпліцэ-Шанаў), у пахаванні XLV, акрамя рэштак вядра каля правай нагі, у далоні нябожчыка ляжаў дэнарый князя Спіцігнева II (1055–1061 гг.). Нябожчык меў узрост каля 35 гадоў. У іншым пахаванні таго ж могільніка трапілася манета князя ВрацІслава II (1061–1092 гг.), што дазваляе датаваць могільнік у цэлым другой паловай XI ці нават пачаткам XII ст. У могільніку Вінаржыцэ (акруга горада Сланы ў сярэдняй Чэхіі), акрамя абручоў ад вёдраў і іншых рэчаў, знаходзілі пры раскопках дэнарыі князёў Бржэціслава I (1034–1055 гг.) і Бржэціслава II (1092–1100 гг.) [Turek, 1948, s. 514–515]. Зрэшты, адной з самых позніх праяў звычаю ставіць вёдры ў магілы лічыцца пахаванне ў могільніку Горні Дунаёвіцы (на поўдні Маравіі), якое датуецца дэнарыем першай паловы XII ст. Таксама на поўдні Маравіі, у могільніку Высачаны – над – Дыяй, вёдры трапляліся ў пахаваннях, якія адносіліся да другой паловы IX – сярэдзіны X ст. [Eisner, 1966, s. 427]. Вёдры знаходзілі ў могільніках Стары Коуржым (усходней Прагі) (Мал. 2,*1–8*), дзе розныя іх формы адносяцца да канца IX – пачатку X ст., і ў Мікульчыцах (Маравія) [Krumphanzlová, 1974, s. 75]. У грунтовым могільніку з інгумацыяй каля гарадзішча Будзечы (заходней Прагі), акрамя іншых рэчаў, сустрэты і рэшткі вёдраў. Паводле пахавальнага інвентару, могільнік датуецца перыядам ад канца IX да сярэдзіны X ст. Драўляныя вёдры з жалезнымі абручамі знойдзены і пры раскопках грунтовага могільніка II з трупапалажэннямі недалёка ад горада Лібіцэ-над-Цыдлінай [Седов, 1995, с. 315]. У могільніках белабрдоўскай культуры, якая з'яўляецца праявай славяна-мадзьярскага сімбіёзу і склалася ў першай палове X ст., вёдры таксама дзе-нідзе вядомыя, у прыватнасці, у Нітры (Славакія). Таксама ёсць яны ў славянскіх пахаваннях сярэдзіны X – сярэдзіны XI ст. ва ўрочышчы Вендэлін каля Шобу, на поўначы Венгрыі [Eisner, 1966, s. 426]. Рэшткі драўляных вёдраў знойдзены ў курганных могільніках з трупаспаленнямі ў Нушфалэу (Шлагынагыфалу) і Сомешэні у Трансільваніі, на паўночным захадзе Румыніі [Комша, 1958, с. 525–534; Макря, 1958, с. 551–570; Eisner, 1966, s. 427], куды ў раннім сярэднявеччы таксама пранікалі славяне. Румынскі археолаг Марыя Комша датавала курганы ў Нушфалэу канцом VIII – пачаткам IX ст., і меркавала, што абодва гэтыя могільнікі пакінуты славянскімі перасяленцамі з Сярэдняга Падунаўя ці тэрыторыі Чэхіі, адкуль вымушаны былі сысці ў выніку перамогі франкаў Карла Вялікага над аварамі [Комша, 1978, с. 99–100].




Мал. 3. Драўляныя вёдры са славянскіх сярэднявечных пахаванняў (*1–3* – Орослань I; *4* – Стшэмешыцэ Вельке)
Fig. 3. Wooden buckets from Slavonic medieval burials (*1–3* – Oroszlány I; *4* – Strzemieszyce Wielkie)

Але найбольш распаўсюджанай гэта прыналежнасць пахавальнага інвентару была ў могільніках насельніцтва Вялікамараўскай дзяржавы, а таксама ў залежных ад яе чэшскіх землях. На вялікамараўскім паселішчы Старэ Места (паблізу г. Угерске Градзіштэ на паўднёвым усходзе Чэхіі, недалёка ад мяжы са Славакіяй) быў даследаваны вялікі могільнік, які размяшчаўся па суседству з хрысціянскім храмам. У пахаваннях, акрамя керамічнага посуду, зброі, упрыгожанняў, прыладаў працы, знойдзены і драўляныя вёдры або цэбры з жалезнымі абручамі [Седов, 1995, с. 291]. Мяркуючы па тым, што храм дзесьці адразу пасля 900 г. быў канчаткова разбураны, у гэты час напэўна перасталі функцыянаваць і могілкі. У могільніку Мікульчыцы-Клаштэржыска, размешчаным каля раннесярэднявечнага паселішча гарадскога тыпу (у Цэнтральнай Маравіі) шэраг пахаванняў з трупапалажэннямі, акрамя іншых рэчаў, утрымліваў дужкі, абручы і вушкі ад драўляных вёдраў (мал. 2, *9*) [Klanica, 1985, obr. 11:6,13,

obr. 15:13, obr. 19:1]. Большасць магіл датуецца IX ст. [Klanica, 1985, s. 536]. Рэшткі драўляных вёдраў сустракаюцца таксама ў дзесятках іншых вялікамараўскіх пахавальных помнікаў [Dostál, 1966, s. 85–86, 201]. Ва ўласна Чэхіі пахаванні вялікамараўскага часу з рэшткамі вёдраў вядомыя ў могільніках Прага-Відоуле, Пражскі Град, Лахавіцы (каля Прагі), Заколаны, Стодулкі, Ошкобрх (каля Падэбрадаў), Дабрамержыцы і іншыя [Krumphazlová, 1974, s. 74–77].

У могільніку з трупапалажэннямі Скаліца (на захадзе Славакіі) знойдзеныя рэшткі вёдраў, датаваныя IX стагоддзем, у асноўным другой яго паловай [Budinský-Krička, 1959, s. 22–23]. Пахавальны інвентар магілаў у Дольным Петры IV (Святым Петры) у акрузе Камарна на поўдні Славакіі сярод іншых прадметаў меў абручы, дужкі і вушкі ад драўляных вёдраў (мал. 2,*11*), якія па аналогіях са знаходкамі з іншых помнікаў адносяцца ў асноўным да другой паловы IX ст. [Béreš, 1995, s. 150–151]. У могільніку каля с. Велькі Гроб, у акрузе Сянец, у пахаванні 48, дзе не мелася іншых рэчаў, абручы ад вядра ляжалі каля ног нябожчыка [Chropovsky, 1957, s. 178–179, 215]. У могільніку Завада (акруга горада Тапальчаны) у пахаванні III вядро разам з сякеркай, нажом і брытвай складалі пахавальны інвентар мужчыны 40–50 гадоў. Пахаванне адносіцца да ліку самых ранніх у могільніку і датуецца першай паловай IX ст. [Bialeková, 1982, s. 125, 159].

Ад 560-х гадоў і да самага пачатку IX ст. славяне Сярэдняга Падунаўя знаходзіліся пад уладай Аварскага каганату, які быў канчаткова разгромлены толькі ў выніку ваенных паходаў правіцеля франкаў Карла Вялікага. На познім этапе існавання каганату качэўнікі-авары паступова змешваліся з колькасна больш шматлікім славянскім насельніцтвам і пераходзілі да земляробства. Вядомыя досыць шмат могільнікаў і паселішчаў, якія адлюстроўваюць такі міжэтнічны сімбіёз. У г. Камарна (Славакія) ў могільніку на вул. Варадзі рэшткі вёдраў сустрэты ў большасці пахаванняў вершнікаў. Тыпалагічна можна інвентар могільніка аднесці да комплексу матэрыяльнай культуры познеаварскага перыяду. З.Чылінска, якая даследавала гэты помнік, мяркуе, што вёдры былі складовай часткай амуніцыі вершніка, а не рытуальнай рэччу для нябожчыка [Čilinska, 1982, s. 349, 351, 392, 393], з чым нельга пагадзіцца. У адваротным выпадку вёдры былі б абавязковай прыналежнасцю вершнікаў у розных народаў, у тым ліку качавых, што супярэчыць археалагічным матэрыялам. Могільнік функцыянаваў ў другой палове VIII ст., а таксама ў IX ст. Хаця ў дадзеным выпадку як звычай хаваць разам з коньмі, так і частка інвентару адлюстроўваюць уплыў авараў, але звычай ставіць вёдры ў пахаванні мае славянскае паходжанне. Яшчэ больш раннім помнікам з'яўляецца славянскі грунтовы могільнік у Чакаёўцы (недалёка ад Нітры), у якім частка пахаванняў зроблены па абраду трупаспалення. У пахаванні 833 побач з рэшткамі крэмацыі жанчыны знойдзена гліняная пасудзіна, падпраўленая на ганчарным коле, і фрагменты жалезнага абруча (мяркуецца, што ад драўлянага вядра). Пахаванне паводле асаблівасцяў керамікі можна аднесці да VIII ст. [Rejholcová, 1990, s. 363, 416]. У славяна-аварскім могільніку Новэ Замкы (на р. Нітра ў Славакіі) у цэлым шэрагу пахаванняў былі металічныя дэталі ад драўляных вёдраў, якія З. Чылінска лічыць характэрнымі для VII–VIII ст. [Čilinska, 1966, s. 180]. На раннеславянскім могільніку ў Дэвінскай Новай Всі (Славакія), які датуецца VI–VIII ст., з 875 пахаванняў прыблізна ў 20 % іх былі знойдзены рэшткі драўляных вёдраў. Такая вялікая распаўсюджанасць звычаю ставіць у магілы гэты від начыння можа сведчыць, што ў мясцовых славянаў традыцыя пахаванняў з вёдрамі мела даўнія карані [Zeman, 1956, s. 103]. Аварскім імпартам сярэдзіны VII ст. у прусаў лічыцца кованае вядро з бронзавымі абручамі, якое паходзіць з Ментке недалёка ад Ольштына (у сучаснай Польшчы). Вядро было зроблена з дошчачак і акута папярочнымі металічнымі палоскамі, мела металічную дужку [Okulicz-Kozaryn, 1997, s. 136]. Але найбольш раннім у гэтых адносінах лічыцца славянска-аварскі могільнік пачатку VII ст. Орослань I на поўначы Венгрыі, дзе большасць пахаваных арыентавана галавой на захад. Акрамя ляпной керамікі пражска-карчакскага тыпу, у некаторых пахаваннях сустрэты драўляныя вёдры з бронзавымі абручамі (мал. 3, *1–3*) [Sós, 1958, s. 106–119, Abb. 16–18]. Рэшткі вёдраў былі і ў могільніку Орослань II [Szatmári, 1980, Abb. 10, Abb. 12–Abb. 14].




Мал. 4. Вёдры з пахаванняў латэнскай культуры (*1, 2*) і перыяду рымскіх уплываў (*1* – Алесфорд, Англія; *2* – Мальбара, Англія; *3* – Цемніцэ, Польшча; *4* – Сакольніцэ, Чэхія; *5* – Вуцікэ, Германія; *6* – Закшуў, Польшча; 7 – Цэйкаў, Славакія; *8* – Астравяны, Славакія; *9* – Шэлёнг, Польшча)

Fig. 4. Buckets from the burial places of the La Tène culture (*1, 2*) and of the period of Roman influence (*1* – Aylesford, England; *2* – Marlborough, England; *3* – Ciemnice, Poland; *4* – Sokolnice, Czech Republic; *5* – Wutike, Germany; *6* – Zakrzów, Poland; *7* – Cejkow, Slovakia; *8* – Ostroviany, Slovakia; *9* – Szeląg, Poland)

Падобна таму, як у Аварскім каганаце авары пераймалі славянскія звычаі, некаторыя асаблівасці славянскай культуры сталі запазычаць і качэўнікі – венгры пасля авалодання ў канцы IX – пачатку X ст. Панонііяй. На мадзьярскім могільніку ў Секешфехервар – Радыётэлеп вёдры сустракаюцца ў пахаваннях багатых мужчын і жанчын, паколькі заможная праслойка хутчэй пераймала іншаэтнічныя звычаі. Вёдры вядомыя не толькі ў пахаваннях славян Усходняй Еўропы, цяперашняй Польшчы і Сярэдняга Падунаўя. Вядома таксама, што пахаванні з драўлянымі вёдрамі меліся і ў харватаў Далмацыі [Eisner, 1966, s. 427]. У прыватнасці, такія пахаванні даследаваліся археолагамі ў Dubravice (каля горада Скрадін у цэнтральнай частцы адрыятычнага ўзбярэжжа Харватыі), дзе датуюцца, верагодна, VIII ст. [Gunjača, 1995, s. 162–163], а таксама ў *Biskupija-Crkvina* каля г. Кнін (недалёка ад мяжы з Босніяй), у інвентары меліся візантыйскія манеты 760–775 гг. [Mirnik, 2004, s. 226, 240, 241], а паўднёвей – у Біхачы каля Мравінцаў (ваколіцы Спліта) [Karaman, 1940, s. 26–27]. На ўсходзе Харватыі, недалёка ад мяжы з Сербіяй, пахаванні з вёдрамі ў Вінкаўцах (Vincovci) датаваныя па С14 канцом VII – сярэдзінай VIII ст. [Ivančan, Tkalčec, 2007, s. 149, 157, 162].

Магчыма, тлумачыцца гэта тым, што каля ўсходняга ўзбярэжжа Адрыятыкі сустрэты пэўныя сляды першапачатковага пранікнення насельніцтва пражскай культуры, хай сабе і нешматлікія. Так, грунтовы могільнік з трупаспаленнямі і ляпной пасудзінай VII ст. адкрыты ў Кашычы паблізу Задара (Харватыя). На некаторых славянскіх паселішчах Адрыятыкі першай паловы VII ст. вядомыя паўзямлянкі, характэрныя менавіта для пражскай культуры. Харвацкі археолаг З. Вінскі мяркуе, што першыя славяне, у тым ліку належачыя да пражска-карчакскай групы, з'явіліся ў Далмацыі разам з аварамі ў канцы VI – пачатку VII ст. [Седов, 1995, с. 29–30, 321].

Але на тэрыторыях цяперашніх Польшчы,Славакіі і Чэхіі звычай ставіць драўляныя вёдры ў пахаванні існаваў задоўга да з'яўлення славян. Вёдры сустракаліся яшчэ ў пахаваннях пшэворскай культуры, якая займала ў рымскі перыяд усю паўднёвую частку цяперашняй Польшчы (за выключэннем крайняга паўднёва-заходняга кутка). У прыватнасці, добра захаванае вядро з драўляных дошчачак з бронзавымі абручамі выяўлена ў "княскім" пахаванні ў Вроцлаве-Закшуве (мал. 4, *6*) [Wielowiejski, 1981, s. 419–420, рус. 206, 3]. Інвентар пахавання

быў надзвычай багатым. Могільнік належыць да сілезска-славацкай групы “княскіх” пахаванняў III–IV ст. К. Гадлоўскі ўказваў, што ў пахаваннях пшэворскай культуры раннерымскага перыяду сустракаліся ў невялікай колькасці драўляныя вёдры, зробленыя з суцэльнага кавалка дрэва, ад якіх захаваліся доўгія, з якарападобнымі раздвааеннямі на канцы, жалезныя акоўкі, і зрэдку металічныя дужкі. Вёдры з дошчачак з’явіліся ў пачатку познерымскага перыяду, найбольш распаўсюдзіліся ў фазе $C_2$ (другая палова III ст.), сустракаюцца і ў фазе D (другая палова IV – сярэдзіна V ст.). У большасці гэта былі невялікія пасудзіны цыліндрычнай формы, зробленыя з драўніны ціса, з металічнымі абручамі. Асабліва часта вёдры сустракаліся ў інвентары багатых пахаванняў – як мужчынскіх, так і жаночых [Godłowski, 1981, s. 73–74]. На познім этапе пшэворскай культуры яе помнікі вядомыя і ў Славакіі, дзе ў могільніку Цэйкаў (Cejkov) даследавана багатае жаночае пахаванне IV ст., у якім было драўлянае вядро з бронзавай абіўкай (мал. 4, *7*) [Буданова, 2000, с. 60, рис. 17; Zeman, 1956, s. 91, obr. 4, 5, s. 101]. Але найбольш драўляныя вёдры з жалезнымі абручамі траплялiся ў могільніках любошыцкай культуры, прытым досыць часта ў адносінах да агульнай колькасці пахаванняў [Domański, 1981, s. 267]. Любошыцкая культура існавала з сярэдзіны II да мяжы IV–V ст. і ахоплівала тэрыторыю паўночнай часткі Ніжняй Сілезіі, Верхнюю і Ніжнюю Лужыцы, паўднёвую частку Брандэнбурга, Любускую зямлю і ўсходнюю Саксонію. Па этнічнай прыналежнасці насельніцтва абедзвюх гэтых культур лічаць германцамі, прычым пшэворскую культуру звычайна атаясамліваюць з вандаламі, а любошыцкую – з бургундамі. Пахаванні з вёдрамі ранняга рымскага перыяду вядомыя каля Жондза паблізу Грудзёндза (I ст. н.э.) і ў ваколіцах Інаўроцлава, а таксама ў Сілезіі, так і ў Мекленбургу (Германія). У познім рымскім перыядзе пахаванні з драўлянымі вёдрамі былі распаўсюджаны ва ўсім басейне Одры, дзе-нідзе на Заходнім Паморʼі, ва ўсходняй частцы Германіі, у Даніі і Швецыі, у пэўнай меры – у Славакіі (ужо згаданы Цэйкаў, а таксама Стражэ каля Пештан і Астравяны) і Чэхіі (Сакольніца каля Брно у Маравіі) (мал. 4, *4, 8*). У Прушчы-Гданьскім (Польшча), у пункце 5 пры раскопках могільніка (у пахаванні 1) знайшлі, апрача глінянага посуду, эфектнага шклянога кубка і фрагментаў шкляной бутлі, таксама металічныя акоўкі ад драўлянага вядра, медную міску, бронзавы ножык, срэбную спражку, грэбень высокага класу выканання і фібулу. Пахаванне датуецца перыядам каля мяжы IV і V ст., калі ў нізоўях Віслы хутчэй за ўсё складваўся міжплемянны саюз відзіварыяў, пра які пазней пісаў гоцкі гісторык Іардан [Kokowski, 2007, s. 258, rус. 120, s. 261]. У курганным могільніку Земплін на ўсходзе Славакіі (пахаванне 23), акрамя шэрагу іншых рэчаў, знойдзены жалезныя часткі вядра. Могільнік з’яўляўся поліэтнічным (кельты, дакійцы і насельніцтва пшэворскай культуры) і адносіцца ў асноўным да I–II ст., хаця ёсць і больш раннія пахаванні [Budinsky-Krička, Lamiová-Scmiedlová, 1990, s. 249, pl. III, 21–35, pl. IV, 1–6].

У пахаваннях вельбарскай культуры вёдры сустракаюцца пераважна у раёнах, блізкіх да Балтыйскага ўзбярэжжа, на Усходнім Паморʼі. У арэале роднаснай “вельбарцам” чарняхоўскай культуры у пахаваннях таксама вядомыя драўляныя вёдры з жалезнымі дэталямі (Кампанійцы, Балцаці, Чумбруд), а ў могільніках Рудка і Ханска-Лутэрыя – бронзавыя вёдры. Даследчык гэтай культуры Б.В. Магамедаў звяртае ўвагу на тое, што комлексы “княскіх” пахаванняў Германіі і Польшчы познерымскага часу (тып Hassleben-Leuna-Sackrau) утрымлівалі рытуальныя сервізы для віна,якія падкрэслівалі прэстыж арыстакратыі і ўключалі дарагія імпартныя рэчы: бронзавыя таз,чарпак і сіта, бронзавае або драўлянае вядро, шкляныя, срэбныя і гліняныя кубкі, а таксама прыналежнасці азартных гульняў рымскага паходжання. У могільніках чарняхоўскай культуры набор рытуальнага посуду мог быць спрошчаным, і ўключаць мясцовыя гліняныя імітацыі шклянога посуду і вёдраў добрадзеньскага тыпу (напрыклад, керамічная імітацыя вядра ў крэмацыі № 5 з Кабаргі і знаходкі з тэрыторыі Румыніі) [Магомедов, 2001, с. 32–33, 85].

Яшчэ раней драўляныя вёдры былі часткай пахавальнага інвентару латэнскай культуры, якая атаясамліваецца са старажытнымі кельтамі. Такія пахаванні вядомыя як і ў самім Ла-Тэне, дзе іх храналогія акрэсліваецца сярэдзінай III–I ст. да н. э., так і на землях сучаснай Чэхіі – у

Страдоніцах (акруга Бероун), Малым Градзіску каля Кромержыжа і ў Карлстайне каля Райхэнхаля. У шырокім сэнсе прарадзімай драўляных вёдраў лічыцца Сярэдняя Еўропа на поўнач ад Альпаў. У выніку экспансіі кельтаў на Брытанскія астравы туды быў занесены і звычай пахавання з драўлянымі вёдрамі. Гэтая прыналежнасць пахавальнага інвентару вядомая, у прыватнасці, у могільніках з крэмацыяй Алесфорд (у Кенце) і Мальбара (ва Уілтшыры) [Zeman, 1956, s. 86–87]. На металічных палосах аковак вёдраў з Алесфорду і Мальбара маецца арнамент, стылізаваныя выявы жывёл і чалавечых твараў (мал. 4, *1, 2*). Нямецкі даследчык А. Гётцэ яшчэ ў 1920-я гады звяртаў увагу на падабенства кельцкіх драўляных вёдраў і больш старажытных гальштацкіх цыстаў [Zeman, 1956, s. 87]. Сапраўды, бронзавыя вёдры цыліндрычнай і ўсечанаканічнай формы – цысты і сітулы – былі характэрнымі для пахаванняў позняга этапу гальштацкай культуры, у тым ліку яны выяўлены і ў самім Гальштацкім могільніку, які адносіцца да часу паміж 750 і 400 гг. да н.э. [Монгайт, 1974, с. 178–179].

Акрамя пахаванняў з вёдрамі, у арэале латэнскай культуры вядомыя ахвярныя калодзежы, у якіх таксама часам знаходзяць драўляныя вёдры. Напрыклад, пры раскопках у Фельбах-Шмідэн каля Рэмса (на захадзе Германіі) была расчышчана шахта глыбінёй 20,5 м, сцены якой былі ўмацаваныя драўляным зрубам шырынёй 1,2–1,55 м. Калодзеж быў запоўнены касцямі жывёл, вуголлем, абломкамі керамікі і рознымі іншымі рэчамі, сярод якіх – фібулы, сякера, драўляны меч, драўляныя фігуры двух казлоў і аленя, драўлянае вядро. Калодзеж выкарыстоўваўся доўгі час, таму што знаходкі датуюцца перыядам прыблізна ад 125 г. да н. э. і да II ст. н. э. Драўляныя вёдры трапляюцца і ў культавых калодзежах на тэрыторыі Францыі. У некаторых калодзежах выяўлены бронзавыя сітулы [Русанова, 2002, с. 32–34, рис. 36]. Трэба адзначыць, што наяўнасць у такіх калодзежах вады не з'яўлялася абавязковай. Бронзавыя сітулы знаходзяць сярод ахвяраванняў і на свяцілішчах германцаў II–V ст. н.э. [Русанова, 2002, с. 52, 59].

Недастаткова яшчэ вывучана пытанне, ад якіх неславянскіх плямёнаў Цэнтральнай Еўропы звычай пахавання з драўлянымі вёдрамі быў запазычаны насельніцтвам пражскай культуры. Можна меркаваць, што гэта адбылося на тэрыторыі сучасных заходняй Славакіі, Маравіі ці паўночна-заходняй Венгрыі ў выніку кантактаў славян з германскім племем лангабардаў, якое займала тую тэрыторыю да 568 г., г.зн. да моманту перасялення апошніх у паўночную Італію ў сувязі з аварскім нашэсцем на Сярэдняе Падунаўе. Першапачаткова, да апошніх дзесяцігоддзяў IV ст. лангабарды жылі на ніжняй Эльбе, і пасля міграцыі занялі ў сярэдзіне V – пачатку VI ст. землі на сярэднім Дунаі. Напрыклад, у лангабардскім могільніку Лужыцэ (на тэрыторыі Маравіі), які датуецца канцом V – першай паловай VI ст., у пахаванні 55 сярод іншых рэчаў знойдзены акаванае шырокімі металічнымі палосамі драўлянае вядро. Рэшткі драўлянага вядра былі і ў пахаванні на могільніку Шаквіцэ [Tejral, 2005,s.156, Abb. 13, *C18, D 11*]. Як сведчаць археалагічныя матэрыялы, рэгіянальнага размежавання паміж славянскімі і лангабардскімі пахаваннямі ў могільніках не наглядаецца. Больш таго, мела месца некаторае змешванне лангабардскіх і славянскіх элементаў, што сведчыць пра пачатак славяна-лангабардскай метысацыі. Пасля перасялення лангабардаў у Італію мараўскія землі былі шчыльна заселены славянамі [Седов, 1995, с. 25–28]. Дарэчы, І. А. Гаўрытухін звяртае ўвагу на тое, што ў могільніку Орослань,акрамя ляпной керамікі пражскага тыпу, меўся ганчарны посуд, характэрны для германцаў [Гавритухин, 1997, с. 44].

У эпоху Вялікага перасялення народаў звычай пахавання з драўлянымі вёдрамі захаваўся і быў занесены гарманцамі каля 400 года ў правінцыйнарымскае асяроддзе. У прыватнасці, часам каля 400 года датуюцца пахаванні ў Лампэртгайме каля Вормса ў заходняй частцы Германіі і ў Фурфоа (Furfooz) у Бельгіі. Да пачатку V ст. адносяцца акаваныя вёдры з могільніка ў Луг (былы Кёнігсбрух) каля Гуры на поўначы Ніжняй Сілезіі (Польшча). У Кальштрасэ каля Веймару ў Германіі вядомае жаночае пахаванне другой паловы V ст. з акаваным жалезам вядром, а ў Обэрмёллеры (Цюрынгія) – пахаванне першай паловы VI ст., дзе вядро мела жалезныя абручы. Пахаванні з вёдрамі былі распаўсюджаныя ў шэрагу могільнікаў

меравінгскага перыяду (Монсгайм у Саксоніі, Соэст у Вестфаліі, у Вісбадэне, у Гадорфе каля Коліна над Рэйнам, Базелі – Бэрнерынгу у Швейцарыі). Пахаванне воіна з вядром у Энгельмансховене каля Лімбурга ў Бельгіі датуецца пачаткам VI ст. [Zeman, 1956, s. 95–96]. Звычай пахавання з вёдрамі быў распаўсюджаны таксама ў англа-саксаў. У Саттон-Ху (Норфолк у Англіі) даследавана пахаванне караля Рэдвальда, які памёр у 625 г. На пахавальным караблі, акрамя зброі, упрыгожанняў і бытавых рэчаў, знойдзена драўлянае вядро, абітае жалезам. Вядома, што Рэдвальд пэўны час быў хрысціянінам, а потым ізноў вярнуўся ў язычніцтва.

У насельніцтва Скандынавіі традыцыя пахавання з драўлянымі вёдрамі існавала не толькі ў рымскую эпоху, але і пазней, у эпоху вікінгаў. Вёдры знойдзены пры раскопках могільнікаў Біркі (Швецыя) і Хедэбю (Данія). Многія пахаванні вікінгаў на славянскіх тэрыторыях таксама маюць у пахавальным інвентары гэту прыналежнасць. Такія знаходкі вядомыя ў так званых "вялікіх курганах" Усходняй Еўропы – у Міхайлаўскім і Цімераўскім могільніках каля Яраслаўля, "вялікім кургане" у Сярэднім горадзе Пскова, кургане ва ўрочышчы Плакун у Старой Ладазе. Усе гэтыя курганы датуюцца X – пачаткам XI ст., і звязваюцца з выхадцамі са Скандынавіі [Седых, 1997, с. 28–31]. Сюды ж трэба аднесці пахаванні ў Калдусе (каля Хэлмна, Польшча) і ў Шаставіцах (поўнач Украіны). Адзначаны пахаванні з вёдрамі і ў Гнёздаве (недалёка ад Смаленска), дзе прысутнасць скандынаваў асабліва адчуваецца [Булкин, 1982, с. 140, 141]. У кургане Чорная Магіла (Чарнігаў ва Украіне) каля галоў трох пахаваных паўколам стаяла каля 12 вёдраў. Асаблівасці пахавальнага абраду і некаторыя характэрныя рэчы інвентару дазваляюць прызнаць пахаванні належачымі выхадцам са Скандынавіі, а датыроўка вызначаецца наяўнасцю залатой візантыйскай манеты імператара Канстанціна VII Парфірагенета і яго сына Рамана II (945–959 гг.). Драўляныя вёдры каля галоў нябожчыкаў Б. А. Рыбакоў лічыў прызначанымі для вадкасцяў кшталту мёду, віна або піва [Рыбаков, 1949, с. 28, 42]. У кургане № 829 каля Пляшчэева возера (паўднёвы захад Яраслаўскай вобл., Расія) былі ўпрыгожанні скандынаўскага стылю, а таксама драўлянае вядро з жалезнымі абручамі.

Такім чынам, схема распаўсюджання традыцыі пахавання нябожчыкаў з драўлянымі вёдрамі і звязаных з гэтым светапоглядных уяўленняў вымалёўваецца наступным чынам. Напачатку гэтая частка пахавальнага інвентару з'явілася ў могільніках кельтаў (латэнская культура), а ў рымскі час распаўсюдзілася ў насельніцтва пшэворскай і любошыцкай культур, насельніцтва якіх па этнічнай прыналежнасці большасць даследчыкаў лічыць германскім. Звычай пранік таксама да германскага насельніцтва правабярэжжа ніжняй Эльбы, сучасных Даніі і Швецыі. Дзякуючы экспансіі пшэворскай культуры на поўдзень, пахаванні з вёдрамі з'явіліся ў познерымскі час на тэрыторыях Славакіі, Маравіі, у пэўнай меры Чэхіі. У Маравіі, заходняй Славакіі і Паноніі ў другой палове V – 60-х гадах VI ст. традыцыя магла захавацца дзякуючы лангабардам (германцам), у час пражывання якіх на гэтых абшарах пачаліся кантакты са славянскім насельніцтвам пражскай культуры, пранікненне якога тады адзначаецца. Пасля зыходу ў 568 г. лангабардаў у Італію іх ранейшы арэал засяляецца славянамі, якія трапілі пад уладу качэўнікаў-авараў. У славянскіх могільніках аварскага перыяду першыя вядомыя пахаванні з драўлянымі вёдрамі адносяцца да пачатку VII ст., хаця сам звычай з'явіўся ў насельніцтва пражскай культуры ў тым рэгіёне, хутчэй за ўсё, раней. За час аварскага панавання традыцыя пахавання з драўлянымі вёдрамі распаўсюдзілася ў славянскага насельніцтва Славакіі і Маравіі, а паасобныя імпульсы пад уплывам авараў дасягалі зямель прусаў, ад якіх аднак далейшае пранікненне на ўсход не адзначаецца. У пасляаварскі час традыцыя пахавання з вёдрамі захоўвалася ў Вялікай Маравіі і чэшскіх землях, дзе дажыла да першай паловы XII ст. уключна. На тэрыторыі Польшчы ў другой палове I тысячагоддзя яе прасачыць цяжка, паколькі пахавальныя помнікі сукаўска-дзедзіцкай культуры практычна невядомыя. Але ў могільніках XI – першай паловы XII ст., якія належаць нашчадкам насельніцтва гэтай культуры, пахаванні з вёдрамі распаўсюджаны па ўсім былым яе арэале. У другой палове X – пачатку XII ст. пахаванні з вёдрамі сустракаюцца ў курганных

могільніках шэрагу славянскіх плямёнаў Усходняй Еўропы. Звяртае на сябе ўвагу тое, што большасць з гэтых плямёнаў – дрыгавічы, валыняне, драўляне і паляне – узніклі на аснове больш ранняй культуры тыпу Лукі-Райкавецкай, якая ў сваю чаргу склалася на аснове пражскай культуры. Максімальнае распаўсюджанне пахаванняў з драўлянымі вёдрамі ў славян XI–XII ст. ахапіла тэрыторыі, занятыя нашчадкамі насельніцтва пражскай і сукаўска-дзедзіцкай культур, у некаторай меры датычыла плямёнаў, на якія нашчадкі пражскай культуры аказалі пэўны ўплыў (севяране, радзімічы, паўднёвая частка полацка-смаленскіх крывічоў). У нашчадкаў насельніцтва пяньkoўскай культуры (улічаў, ціверцаў, белых харватаў), а таксама ў вяцічаў, ільменскіх славян і значнай часткі крывічоў пахаванні з вёдрамі невядомыя. Не было такіх пахаванняў і ў славян Балканскага паўвострава, за выключэннем некаторых могільнікаў у Далмацыі, якія верагодна з'явіліся ў выніку інфільтрацыі паасобных груп насельніцтва пражскай культуры або яго нашчадкаў. Нягледзячы на тое, што храналогія пражскай і сукаўска-дзедзіцкай культур абмяжоўваецца VI–VII ст., узнікшыя на іх аснове плямёны нават напярэдадні прыняцця хрысціянства і ў ранні перыяд двухвер'я яўна перажывалі нейкія агульныя працэсы ў сферы язычніцкага светапогляду і культу, адлюстраваннем чаго з'яўляюцца распаўсюджанне агульных толькі для іх асаблівасцяў пахавальнага інвентару, у тым ліку драўляных вёдраў у магілах.

Звычай ставіць вёдры ў пахаванні, відавочна, трэба выводзіць не з утылітарнага прызначэння гэтай пасудзіны, паўсюдна вядомай, а з яе семантыкі ў міфалогіі і іншых сферах духоўнай культуры. Польскі даследчык Т. Курасіньскі, які абагульніў значны матэрыял, звяртае ўвагу на тое, што на абручах або на блясе,якой былі абабітыя вёдры з пахаванняў, сустракаюцца аплікацыі ў выглядзе паўмесяца, гірляндай размешчаныя вакол начыння. Паводле павер'яў, Месяц мог рэалізоўваць накіраваныя да яго просьбы і прадвызначаць поспех, шчасце і багацце. Маладзік павінен быў спрыяць хуткаму росту і здароўю, а поўня – спеласці і ўрадлівасці [Kurasiński, 2015, s. 191].

